На факультэце мастацкай творчасці ўкараняюцца наступныя курсы

| Кафедра | Назва курса |
|---|---|
| народная песенная творчасць | камп'ютэрныя тэхналогіі апрацоўкі фальклорнага матэрыялу |
| духавая музыка | камп'ютэрныя тэхналогіі ў духавой музыцы |
| эстрадная музыка | камп'ютэрныя тэхналогіі ў музыцы |
| харавое мастацтва | камп'ютэрная апрацоўка музычных тэкстаў |
| харэаграфія | камп'ютэрныя тэхналогіі ў харэаграфіі |
| народная інструментальная творчасць | камп'ютэрны практыкум (у межах курсаў спецыялізацыі) |

Мэта азначаных курсаў - даць студэнтам веды і ўменні па ажыццяўленню камп'ютэрнай падтрымкі тых відаў дзейнасці, якія ўвасабляюць адпаведную спецыялізацыю.

Бураўкін А.Г.,
дацэнт
Зязюля А.Р.,
ст.выкладчык

## ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯ ПРАЦЭСАЎ КІРАВАННЯ Ў КУЛЬТУРЫ

Прыняцце рашэнняў (кіраванне) звязана з аналізам (апрацоўкай) вялікай колькасці разнастайнай інфармацыі. Мэнеджэру ў сферы культуры неабходна валоданне сродкамі сістэмнай і камп'ютэрнай падтрымкі.

Курс «Вылічальная тэхніка» выкладаецца на спецыялізацыі «мэнеджмэнт сацыяльна-культурнай сферы». Мэта курса - даць студэнтам веды аб выкарыстанні камп'ютэрнай тэхнікі з ужываннем стандартных сродкаў сістэмнай падтрымкі.

Змест курса складаюць раздзелы:

- апера цыйная сістэма (MS DOS);
- праграмная абалонка Norton Commander;
- тэкставыя рэдактары (апрацоўка дакументаў);
- спецыялізаваныя праграмныя сродкі (матэматычныя, графічныя метады і элементы канструявання баз звестак на прыкладзе таблічнага працэсара SuperCalc).

Бураўкін А.Г.,
дацэнт
Астапенка А.У.,
дацэнт

## КАМП'ЮТЭРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Структура курсаў, якія ўкараняюцца на музычных спецыялізацыях:

| Кафедры | Аперац. сістэма | Праграм. абалонка NC | Тэкставыя рэдактары | Базы звестак | Музычныя рэдактары |
|---|---|---|---|---|---|
| народная песенная творчасць | ■ | ■ | ■ | ■ | ■ |
| духавая музыка | ■ | ■ | ■ | | ■ |
| харавое мастацтва | ■ | ■ | ■ | | ■ |
| эстрадная музыка | ■ | ■ | ■ | | ■ |
| народная інстр. творчасць | ■ | ■ | ■ | | ■ |

Азначэнні прыярытэтаў:

■ - нязначны;

■ - значны;

■ - вельмі значны;

Кірэеў У.А.,
дацэнт

## ДА ПЫТАННЯ ВЫКАРЫСТАННЯ АЎДЫЁВІЗУАЛЬНЫХ СРОДКАЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ

1. Практычна ўсе мерапрыемствы па розных напрамках выхавання, лекцыі па мастацтвазнаўству і гісторыі карыстаюцца вялікім поспехам, калі яны праводзяцца ў суправаджэнні аўдыёвізуальных сродкаў. З дапамогай іх могуць быць зафіксаваны асобныя

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

фэкты з жыцця. Тэхнічныя сродкі фіксацыі факта маюць шэраг пераваг перад іншымі сродкамі. Па-першае, яны маюць вялікую інфармацыйную ёмістасць (напрыклад, слайдавы партрэт у колеры дае ўсю інфармацыю адразу па некалькіх параметрах: узрост, знешнасць, настрой, характар і інш.). Па-другое, тэхнічныя сродкі маюць аднолькавую здольнасць да перадачы як рацыянальнай, так і эмацыянальнай інфармацыі. Гэта важна таму, што сродак фіксацыі факта з'яўляецца адначасова і сродкам уздзеяння на аўдыторыю, якой заўсёды больш цікава бачыць факты і слухаць аб іх, чым толькі слухаць.

2. Адзначаючы пэўныя поспехі па насычанасці спажывецкага рынку высокаякаснай, у тым ліку і замежнай, АВ-тэхнікай, якая ўключае відэамагнітафоны, відэакамеры, трэба адзначыць жыццяздольнасць слайдаў, тым больш, што іх значна лягчэй маніпіраваць, чым урыўкі з відэафільмаў і кінафільмаў. Акрамя гэтага, слайды могуць быць выкананы спецыяльна па тэме мерапрыемства, адлюстроўваць інфармацыю, цесна звязаную з жыццём і дзейнасцю аўдыторыі. Найбольш эфектыўна ўжываць слайды у выглядзе слайд-фільма, гэта значыць серыі слайдаў, аб'яднаных ідэяй і дэманстрыруемых на экран у суправаджэнні музыкі і тэксту.

Дастаткова доўгая практыка правядзення намі заняткаў паказвае цікавасць студэнцкай аўдыторыі да слайд-фільма.

3. У цыкле лабараторных заняткаў па вывучэнню тэхнічных сродкаў бібліятэчнай і культурна-асветнай работы пэўнае месца адводзіцца методыцы выкарыстання АВ-сродкаў і методыцы стварэння і дэманстрацыі слайд-фільма.

Падрыхтоўка слайд-фільма ўключае:
- выбар тэмы;
- напісанне сцэнарыя;
- пошук аўдыё-, відэаматэрыялу;
- мантаж відэарада;
- мантаж фанаграмы.

Мантаж гуку і відэарада можа мець самыя розныя формы:

- мантаж відэарада ў спалучэнні з фанаграмамі шумаў ці музыкі альбо іх камбінацыя пры поўнай адсутнасці мовы;

- мантаж відэарада з выкарыстаннем дыктарскага тэксту;

- мантаж відэарада і тэксту ў пэўным гукавым фоне;

- мантаж відэарада з умоўна ўяўляемым гукам.

Поспех у вялікай ступені залежыць ад выразнага супастаўлення сцэнарыя, якасці відэарада і гукавога суправаджэння.

4. У той жа час трэба адзначыць той факт, што з'яўленне апаратуры відэазапісу прывяло да новых магчымасцей кансервацыі падзей і дакументаў. Нагляднасць, верагоднасць, перакануўчасць відэазапісу мае вялікую эмацыянальную сілу ўздзеяння на аўдыторыю.

Сучасная відэатэхніка дае магчымасць дэманстраваць падзеі ў дынаміцы і ў той жа час можна ажыццяўляць пакадравы паказ вобразаў (у статыцы) такім жа чынам, як і паказ слайдаў.

Чаплыгіна Т.І.,
ст.выкладчык
Стрыжонак І.М.,
ст.выкладчык

## ПЫТАННІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «АРГАНІЗАЦЫЯ, ЭКАНОМІКА І КІРАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВАЙ»

У наш час адбываюцца пэўныя змены ў сацыяльна-эканамічным развіцці бібліятэкі, якая сёння разглядаецца не толькі як сацыяльная ўстанова, але і як комплексны грамадскі інстытут, які звязвае ў адзінае цэлае прававыя, эканамічныя, палітычныя аспекты яе дзейнасці. Асаблівае месца ва ўдасканаленні традыцыйнай бібліятэчнай тэхналогіі займаюць эканамічныя аспекты дзейнасці бібліятэк. Сацыяльна-культурныя змены патрабуюць пэўнага перагляду зместу і методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін, у тым ліку курса «Арганізацыя, эканоміка і кіраванне бібліятэчнай справай». Прыярытэтнымі сталі пытанні арганізацыі працы бібліятэкі на сучасным этапе. Студэнты афармляюць макет табліцы разліку бюджэту рабочага часу пэўнага аддзела бібліятэкі, а таксама робяць разлік патрабуемай колькасці супрацоўнікаў аддзела і бібліятэкі наогул.

Для засваення асноўных этапаў бібліятэчна-інфармацыйнай тэхналогіі і авалодання шляхамі яе ўдасканалення распрацоўваюцца тэхналагічныя карты на розныя працэсы і цыклы, вызначаецца кошт таго ці іншага цыкла шляхам выкарыстання комплексных і асобных фінансава-вартасных паказчыкаў, нормаў выпрацоўкі і нормаў часу. Але асаблівая ўвага ў выкладанні курса ўдзяляецца пытанням эканамічнага аналізу дзейнасці бібліятэк. На занятках вызначаюць кошт абсалютных паказчыкаў бібліятэчнай работы: выдаткі на адну кнігавыдачу, выдаткі на адно наведванне, кошт абслугоўвання аднаго чытача і інш. Студэнты набываюць навыкі разліку кошту асобных бібліятэчна-бібліяграфічных аперацый. Напрыклад, у ходзе вытворчай практыкі студэнты 4 курса ФБІС універсітэта па заказу ЦГБ імя Янкі Купалы ў Мінску не толькі склалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ